УДК 351.74(476)(09)

***М.А. Асадчук***, курсант факультэта міліцыі

Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук,
дацэнт *С.Ф. Лапановіч*

Рэцэнзент – кандыдат гістарычных навук, дацэнт *В.А. Данілаў*

# АДНАЎЛЕННЕ ДЗЕЙНАСЦІ ОРГАНАЎ УНУТРАНЫХ СПРАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БССР У ПЕРШЫЯ ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1943–1946 гг.)

*У дадзеным артыкуле разглядаецца гісторыя Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС) БССР, пачынаючы з пераломнага ў Вялікай Айчыннай вайне 1943 г. і да моманту перайменавання НКУС у МУС СССР. Асноўная ўвага будзе нададзена вывучэнню тых значных арганізацыйных працэсаў, якія адбываліся ўнутры міліцэйскага ведамства БССР з пачатку вызвалення беларускай зямлі ад нямецкіх акупантаў.*

Уклад супрацоўнікаў органаў унутраных спраў БССР ва ўсенароднае змаганне з нацысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны меў разнастайны і шырокі характар. Перш за ўсё былыя супрацоўнікі савецкай міліцыі ў радах Чырвонай Арміі непасрэдна прымалі актыўны ўдзел у барацьбе з гітлераўцамі. Потым на акупіраванай тэрыторыі сумесна з партызанамі і ў падполлі, дзякуючы іх найцяжэйшай працы, былі сарваны шматлікія аперацыі праціўніка, падарвана функцыянаванне нямецкага тылу. У ходзе дзеянняў у тыле ворага супрацоўнікі Народнага камісарыяту ўнутраных спраў (НКУС) таксама здабывалі важныя разведачныя дадзеныя, якія тым ці іншым чынам дапамагалі Чырвонай Арміі змагацца з войскамі вермахта.

Пачаткам аднаўлення дзейнасці міліцыі ў БССР можна лічыць восень 1943 г., калі былі вызвалены ад нацыстаў Хоцімскі, Касцюковіцкі, Мсціслаўскі, Слаўгарадскі і Клічаўскі раёны. Гэтай жа восенню ў г. Кондрава Смаленскай вобласці створаны першыя аператыўна-чэкісцкія групы, задача якіх – непасрэдная падрыхтоўка да аднаўлення працы органаў міліцыі на вызваленай тэрыторыі рэспублікі [1, с. 102].

Аператыўна-чэкісцкая група Упраўлення НКУС па Магілёўскай вобласці, якую ўзначальваў палкоўнік міліцыі У.І. Сырамолатаў, накіроўвала ў вызваленыя раёны сваіх супрацоўнікаў, якія паспяхова выконвалі задачы па аднаўленні мірнага жыцця і падтрыманню грамадскага парадку ў райцэнтрах і іншых населеных пунктах. Такая група Упраўлення НКУС па Віцебскай вобласці, створаная крыху пазней пад кіраваннем П.Е. Крысанава, у першы час аказвала вялікую дапамогу



партызанам, якія дзейнічалі на тэрыторыі вобласці, яшчэ занятай ворагам [1, с. 102–103].

2 ліпеня 1944 г. была вызвалена Вілейка, 5 ліпеня 1944 г. – Маладзечна, 20 верасня 1944 г. Вілейская вобласць была перайменавана ў Маладзечанскую. Начальнікам УНКУС па Маладзечанскай вобласці быў прызначаны Л.С. Сямёнаў [2, с. 171].

8 ліпеня 1944 г. былі вызвалены Баранавічы (у снежні 1944 г. начальнікам УНКУС па Баранавіцкай вобласці стаў А.П. Свірыдаў); 14 ліпеня 1944 г. вызвалілі Пінск (з 20 ліпеня 1945 г. начальнік УНКУС па Пінскай вобласці М.І. Адзінцоў); 16 ліпеня 1944 г. – Гродна (з 12 кастрычніка 1944 г. начальнік УНКУС па Гродзенскай вобласці І.І. Горлаў); 28 ліпеня 1944 г. – Брэст (з 20 ліпеня 1945 г. начальнік УНКУС па Брэсцкай вобласці В.В. Радчанка).

7 кастрычніка 1944 г. Л.П. Берыя падпісаў загад НКУС СССР аб арганізацыі УНКУС Бабруйскай, Гродзенскай, Полацкай абласцей і аб перайменаванні УНКУС па Вілейскай вобласці ў УНКУС па Маладзечанскай вобласці.

Загадам НКУС СССР ад 19 кастрычніка 1944 г. былі зацверджаны штаты зноў арганізаваных упраўленняў НКУС. Структура апошніх, на прыкладзе УНКУС па Гродзенскай вобласці, была наступнай: кіраўніцтва – начальнік УНКУС, намеснік начальніка ўпраўлення, намеснік начальніка ўпраўлення па міліцыі (ён жа начальнік упраўлення міліцыі), намеснік начальніка ўпраўлення па кадрах; сакратарыят УНКУС (6 чалавек), Упраўленне міліцыі (131); аддзел пажарнай аховы (11); турэмнае аддзяленне (6); аддзел па барацьбе з бандытызмам (25): кіраўніцтва – начальнік аддзела, намеснік начальніка аддзела (сакратарыят АББ (3), група аператыўнага ўліку (2), 1-е аддзяленне (агентурна-аператыўнае) (7), 2-е аддзяленне (па барацьбе з дэзерцірствам) (4), 3-е аддзяленне (следчае) (7); аддзяленне контрвыведкі НКУС «СМЕРШ» (8); аператыўнае аддзяленне (4); аддзяленне па барацьбе з дзіцячай беспрытульнасцю і безнагляднасцю (3); штаб знішчальных батальёнаў (4); штаб МСПА (па аб'ектах УНКУС) (1); група па шыфрработе (2); 1-ы спецаддзел (улікова-архіўны) (15); аддзел кадраў (13); фінансавы аддзел (11); гаспадарчы аддзел (67). Усяго па апарату УНКУС налічвалася 311 чалавек, а па органах НКУС па Гродзенскай вобласці – 1 673.

Па меры адступлення нямецка-фашысцкіх захопнікаў НКУС БССР ствараў новыя аператыўныя групы, якія накіроўваліся ў раёны ў першыя гадзіны іх вызвалення. Некаторыя аператыўна-чэкісцкія групы адначасова падпарадкоўваліся ўжо створаным УНКУС. Так, аператыўна-чэкісцкая група УНКУС па Вілейскай вобласці была перададзена УНКУС Віцебскай вобласці. У яе задачу ўваходзіла арганізацыя дзейнасці міліцыі

ў вызваленых частках Чырвонай Арміі раёнах Вілейскай вобласці. Такія задачы вырашалі і аператыўнікі УНКУС па Мінскай вобласці. У гэтай групе налічвалася 52 супрацоўнікі, на якіх ускладаўся абавязак па аднаўленні органаў міліцыі на тэрыторыі вобласці. 3 ліпеня 1944 г. група пад кіраўніцтвам намесніка наркама ўнутраных спраў палкоўніка С.Д. Красненкова ўвайшла ў г. Мінск. У цяжкіх баях за прыгарады Мінска прымалі ўдзел і супрацоўнікі міліцыі. Калі ў ноч з 5 на 6 ліпеня нямецкія войскі прабіліся на вуліцу Абуўную, на іх шляху ўсталі партызаны і мінская міліцыя. А ў ноч на 7 ліпеня пры спробе гітлераўцаў зноў захапіць г. Мінск і злучыцца з асноўнай масай нямецкіх войскаў, якія знаходзіліся на ўсходзе ад сталіцы, у бой з ворагамі ўступілі партызаны, войскі НКУС і супрацоўнікі міліцыі пад камандаваннем Г.І. Вінаградава [2, с. 211].

Ствараліся і іншыя аператыўна-чэкісцкія групы, якія адначасова з перадавымі часткамі Чырвонай Арміі прыбывалі ў вызваленыя ад гітлераўскіх войскаў раёны. Іх задача – прымаць самыя неадкладныя меры па аднаўленні разбуранай гаспадаркі, аказваць дапамогу войскам Чырвонай Арміі, забяспечваць грамадскі парадак, браць на ўлік калабарацыяністаў, праводзіць збор трафейнай зброі і г. д. [2, с. 103].

28 кастрычніка 1943 г. кіраўніцтва НКУС БССР пераехала ў вызвалены г. Гомель і пачало выконваць свае функцыі ўжо на тэрыторыі рэспублікі. Адна з асноўных задач складалася ў аднаўленні органаў міліцыі на месцах. Хуткімі тэмпамі ішло камплектаванне абласных упраўленняў НКУС, гарадскіх і раённых аддзелаў міліцыі [5, с. 211].

Дзейнасць міліцыі прыняла арганізаваны, скаардынаваны характар пасля аднаўлення НКУС БССР. У другой палове 1943 г. народным камісарам унутраных спраў рэспублікі прызначылі камісара дзяржбяспекі С.С. Бельчанку (у званні – з 17 жніўня 1943 г.), далей ён – камісар дзяржбяспекі 3-га рангу (з чэрвеня 1945 г.), генерал-лейтэнант (з ліпеня 1945 г.), генерал-палкоўнік (з лютага 1958 г.). У канцы 1943 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР выдаў Указ аб падзеле НКУС БССР на два народныя камісарыяты – унутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі [2, с. 103].

Самай вострай у органах міліцыі пасля аднаўлення іх дзейнасці была кадравая праблема. Вырашалася яна наступным чынам. З тылавых раёнаў краіны, часцей Чырвонай Арміі адклікаліся супрацоўнікі міліцыі, якія раней працавалі ў Беларусі. Кадры для працы ў міліцыі рыхтаваліся на розных курсах. На сталую працу ў рэспубліку накіроўваліся супрацоўнікі і з іншых рэгіёнаў СССР. Структура органаў міліцыі пасля іх аднаўлення ў рэспубліцы змянілася нязначна ў параўнанні з даваенным перыядам. НКУС БССР складаўся з некалькіх упраўленняў і аддзелаў, якія ведалі рознымі службамі [2, с. 104].



Да 15 лютага 1944 г. у асноўным завяршылася камплектаванне кіравання НКУС Магілёўскай вобласці. Тут было сфарміравана 13 аператыўных груп, якія налічвалі ў сваіх шэрагах больш за 160 чалавек і па рашэнню абласнога камітэта партыі накіроўваліся ва ўсе раёны вобласці. Пасля аператыўныя групы цалкам уліліся ў органы міліцыі і склалі іх асноўнае ядро. Падобным чынам умацоўваліся адпаведнымі кадрамі гарадскія і раённыя аддзелы Гомельскай, Палескай і іншых абласцей. Так, у Гомельскую вобласць з НКУС БССР было накіравана 340 чалавек аператыўнага складу. 318 з іх увайшлі ў аператыўныя групы – у асноўным па 25 чалавек кожная.

Аднак, нягледзячы на ажыццяўленне гэтых і іншых мерапрыемстваў, недахоп у аператыўных работнікаў застаўся. Таму кіраўніцтва рэспублікі ў складаных умовах ваеннага часу прымала ўсе меры па пошуку людскіх рэзерваў і накіраванні іх на працу ў органы міліцыі рэспублікі. У ліпені 1944 г. у распараджэнне наркамата штаб накіраваў 10 участковых упаўнаважаных і 30 радавых міліцыянераў. З былых партызан была створана і пазаведамасная міліцыя. Толькі ў 1944 г. у міліцыю прыбыло з ліку партызан: у Баранавіцкую вобласць – 45 чалавек, Вілейскую – 31, Пінскую – 26, Полацкую – 40 і Бабруйскую – 15. Вялікае папаўненне атрымаў НКУС Віцебскай вобласці. Сюды прыбылі 550 чалавек з ліку былых партызан. 250 з іх увайшлі ў ізноў створаныя аператыўныя групы. У склад кавалерыйскага эскадрона мінскай міліцыі таксама ўваходзілі партызаны. У ім налічвалася 85 чалавек [2, с. 213].

Кіраўніцтва рэспублікі накіроўвала ў органы міліцыі не толькі былых партызан, але і дэмабілізаваных воінаў. Толькі ў чэрвені 1944 г. 720 салдат Чырвонай Арміі атрымалі міліцэйскую форму.

Вялікую дапамогу ў камплектаванні вопытнымі кадрамі органаў міліцыі рэспублікі аказваў ЦК ВКП(б). На сталую працу ў БССР былі накіраваны супрацоўнікі міліцыі з Валгаградскай, Кемераўскай, Чкалаўскай, Маскоўскай, Горкаўскай, Тульскай, Мурманскай, Іркуцкай, Свярдлоўскай, Ленінградскай абласцей, Краснаярскага, Алтайскага, Прыморскага і Хабараўскага краёў. 1 ліпеня 1944 г. для папаўнення органаў міліцыі БССР прыбылі курсанты Маскоўскай гарадской школы міліцыі, якія былі накіраваны ў Вілейскую, Брэсцкую, Мінскую і Баранавіцкую вобласці. У органы міліцыі БССР цалкам уліўся таксама ўвесь радавы склад Маскоўскага знішчальнага батальёна.

Такім чынам, уся краіна дапамагла ўмацоўваць органы міліцыі БССР. Па дадзеных за снежань 1944 г., у яе шэрагах працавалі 59,4 адсотка

беларусаў, 24,2 – рускіх, 5,6 – украінцаў і 10,8 адсотка прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

У сувязі з хуткім ростам крымінальнай злачыннасці ў Палескай вобласці Наркамат унутраных спраў БССР у тэрміновым парадку накіраваў туды аператыўных работнікаў на чале з начальнікам крымінальнага вышуку ўпраўлення міліцыі НКУС БССР С.В. Кажамякіным [2, с. 214].

Такая мабільнасць і манеўранасць давала партыйным і савецкім органам магчымасць у пэўнай ступені кампенсаваць недахоп кадраў аператыўных работнікаў міліцыі і паспяхова весці барацьбу з бандытызмам і парушальнікамі сацыялістычнага правапарадку.

31 кастрычніка 1944 г. быў выдадзены загад НКУС БССР «Аб фарміраванні аператыўнай школы НКУС БССР», у якім гаварылася аб тым, каб сфарміраваць Мінскую апершколу НКУС БССР для падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі начальніцкага складу НКУС і міліцыі БССР на 300 слухачоў з двух курсаў. Тэрмін навучання ўсталявалі для зноў прынятых адзін год, на перападрыхтоўку – ад трох да пяці месяцаў. За фарміраванне адказваў начальнік апершколы падпалкоўнік міліцыі М.А. Сядлоўскі. Заняткі павінны былі пачацца з 1 снежня 1944 г. [2, с. 121].

Структурныя падраздзяленні НКУС змагаліся з бандытызмам і антысавецкімі выступленнямі, крымінальнай злачыннасцю і крадзяжом сацыялістычнай уласнасці, ахоўвалі дзяржмяжу, грамадскі парадак і асабістую бяспеку грамадзян, займаліся арганізацыяй правядзення пашпартнай сістэмы. Яны таксама забяспечвалі ізаляцыю злачынцаў і іх працоўнае выкарыстанне, утрыманне, ахову і працоўнае выкарыстанне ваеннапалонных і інтэрніраваных, ахову чыгуначных збудаванняў і асабліва важных прадпрыемстваў прамысловасці, арганізацыю пажарнай аховы і мясцовай супрацьпаветранай абароны, змагаліся з дзіцячай беспрытульнасцю і безнагляднасцю, адказвалі за выкананне абаронных, народнагаспадарчых і спецыяльных заданняў урада [1, с. 103–104].

Галоўная роля ў сістэме НКУС належала па-ранейшаму Галоўнаму ўпраўленню міліцыі (ГУМ) як па задачах, ускладзеных на органы міліцыі, так і па колькасным складзе. Менавіта ў Галоўным упраўленні міліцыі вызначаліся і распрацоўваліся асноўныя напрамкі барацьбы са злачыннасцю, аховы грамадскага парадку, абароны правоў і інтарэсаў грамадзян.

Шматгранную дзейнасць міліцыі накіроўвалі і ажыццяўлялі аддзелы ГУМ: палітычны, крымінальнага вышуку, па барацьбе з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці, службы і баявой падрыхтоўкі, дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі, аператыўны, віз, рэгістрацый і загс, пашпартны стол, а таксама аддзяленне навукова-тэхнічных сродкаў. Акрамя таго,



у ГУМ уваходзілі аддзяленні прапаганды і агітацыі, камсамольскай і культурна-асветніцкай працы, а таксама рэдакцыя газеты «На страже Октября». Сярод мноства функцый органаў міліцыі па-ранейшаму галоўнае месца займала барацьба са злачыннасцю і ахова грамадскага парадку, а таксама папярэджанне і раскрыццё злачынстваў, забеспячэнне недатыкальнасці маёмасці савецкіх грамадзян, іх гонару годнасці, барацьба з дзіцячай беспрытульнасцю і безнагляднасцю, ахова грамадскай маёмасці, кантроль за арганізацыяй аховы кантор і аддзяленняў сувязі і іншых устаноў, забеспячэнне бяспекі руху, транспарту і пешаходаў.

Арганізацыйная структура абласных упраўленняў адпавядала структуры Наркамата ўнутраных спраў БССР. Гарадскія і раённыя аддзелы міліцыі ўключалі ў сябе аддзяленні: крымінальнага вышуку, па барацьбе з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці, баявой падрыхтоўкі і аператыўнае. Замест пашпартных сталоў у раёнах працавалі ваенна-ўліковыя сталы, а таксама адрасныя бюро. На чале гарадскога і раённага аддзяленняў НКУС стаяў начальнік, а яго намеснік адначасова быў начальнікам аддзела міліцыі [1, с. 103].

У ліку аддзелаў, якія ўваходзілі ў НКУС рэспублікі ў якасці самастойных адзінак, варта назваць аддзелы прафілактыкі злачынстваў, перавозак, тэхнічнага абслугоўвання, барацьбы з дзіцячай беспрытульнасцю і безнагляднасцю. Вялікую працу выконваў аддзел кадраў, які кіраваў пытаннямі падбору і расстаноўкі кадраў працаўнікоў міліцыі. У НКУС БССР меўся і такі аддзел, як контрвыведка «Смерць шпіёнам» (СМЕРШ), створаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны для барацьбы з дыверсантамі, шпіёнамі, варожай агентурай.

Буйным падраздзяленнем НКУС БССР з'яўлялася Упраўленне пажарнай аховы (УПА). Пажарныя Беларусі праявілі смеласць і мужнасць у гады вайны [1, с. 211]. 21 верасня 1944 г. у БССР была арганізавана школа малодшага камандзірскага складу пажарнай аховы НКУС БССР. У гэтай школе атрымалі падрыхтоўку 50 чалавек, якія пасля сталі арганізатарамі пажарнай аховы ў рэспубліцы.

У верасні ЦК КП(б)Б зацвердзіў склады абкамаў і аблвыканкамаў, у тым ліку і начальнікаў упраўленняў НКУС Бабруйскай, Гродзенскай, Вілейскай, Мінскай абласцей, а ў снежні 1944 г. – Гомельскай, Палескай, Брэсцкай і Магілёўскай абласцей [1, с. 212].

V сесія Вярхоўнага Савета СССР 18 сакавіка 1946 г. прыняла Закон аб пераўтварэнні СНК СССР у Савет Міністраў СССР, а народных камісарыятаў – у міністэрствы. НКУС СССР ператвораны ў Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) СССР. Міністрам унутраных спраў СССР зацверджаны С.Н. Круглоў, а міністрам дзяржаўнай бяспекі СССР –

В.М. Меркулаў. У структуры МУС СССР па-ранейшаму асноўную ролю ў забеспячэнні аховы грамадскага парадку адыгрывала Галоўнае ўпраўленне міліцыі [2, с. 109].

26 сакавіка 1946 г. НКУС БССР перайменаваны ў Міністэрства ўнутраных спраў БССР. У склад яго ўваходзілі наступныя ўпраўленні: міліцыі, па барацьбе з бандытызмам, пажарная аховы, шасэйных дарог, па справах ваеннапалонных і інтэрніраваных, папраўча-працоўных лагераў і калоній, турэмнага, гаспадарчага, архіўнай, пагранвойскаў, а таксама аддзелы кадраў, контрвыведкі, фінансавы, сакрэтнага справаводства, па барацьбе з дзіцячай беспрытульнасцю і безнагляднасцю, «Дынама» і інш. [2, с. 109–110].

Найважнейшым структурным органам МУС БССР было Упраўленне міліцыі (УМ). Яно вызначала асноўныя напрамкі, формы, метады і сродкі барацьбы са злачыннасцю, аховы правапарадку, абароны правоў і інтарэсаў грамадзян. Ажыццяўляла агульнае кіраўніцтва дзейнасцю ўсіх службаў міліцыі рэспублікі, кантралявала працу перыферыйных органаў, распрацоўвала статуты, палажэнні, загады і інструкцыі па пытаннях працы, вывучала і распаўсюджвала перадавы вопыт, кіравала службовай падрыхтоўкай супрацоўнікаў [2, с. 110].

УМ МУС БССР складалася з аддзелаў: палітычнага, крымінальнага вышуку, па барацьбе з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці, вонкавай службы, ДАІ, аператыўнага, віз і рэгістрацыі, загса, пашпартнага, а таксама з аддзяленняў навукова-тэхнічных сродкаў, прапаганды і агітацыі, камсамольскай і культурна-выхаваўчай работы і рэдакцыі газеты «На страже Октября» [2, с. 110].

Такім чынам, у пасляваенны перыяд адбылося структурнае рэфармаванне органаў унутраных спраў, з'явіліся новыя службы, аддзелы, якія вырашалі найважнейшыя задачы на вызваленых тэрыторыях, напрыклад, аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі, барацьба з антысавецкім падполлем на тэрыторыі БССР, барацьба з дзіцячай беспрытульнасцю і безнагляднасцю, барацьба са шпіянажам.У сакавіку 1946 г. Савет Народных Камісараў СССР быў ператвораны ў Савет Міністраў СССР, а народныя камісарыяты – у міністэрствы. Аналагічны працэс адбыўся ва ўсіх Саюзных рэспубліках. НКУС БССР быў перайменаваны ў Міністэрства ўнутраных спраў БССР.

Дадзеныя працэсы адкрылі новую главу ў гісторыі беларускай міліцыі, дапамаглі засвоіць памылкі мінулага, атрымаць новы вопыт у барацьбе з бандытызмам, вырашаць кадравыя пытанні і знайсці свежы погляд на ўдасканаленне міліцэйскага ведамства.



**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Очерки истории милиции Белорусской ССР, 1917–1987 / В.Н. Савичев, А.Ф. Вишневский, Г.И. Балашова [и др.] ; под ред. В.А. Пискарева. – Минск : Беларусь, 1987. – 535 с.

2. Шарков, А.В. НКВД Беларуси в вооруженной борьбе с нацистским агрессором и националистическим подпольем в годы Великой Отечественной войны : [монография] / А.В. Шарков ; М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждение образования «Акад. М-ва внутр. дел Респ. Беларусь». – Минск : Акад. МВД, 2012. – 279 с.

УДК 342.9

***Д.С. Барсук***, курсант факультета милиции

Научный руководитель – кандидат юридических наук, доцент *О.В. Гиммельрейх*

Рецензент – кандидат юридических наук, доцент *И.В. Козелецкий*

## ПОНЯТИЕ, СОДЕРЖАНИЕ И РОЛЬ МОНИТОРИНГА КАК ОБЩЕЙ ФУНКЦИИ ГОСУДАРСТВЕННОГО УПРАВЛЕНИЯ

*В статье исследуются сущностное содержание, назначение, характерные черты и роль мониторинга в управленческом процессе, показано его значение для организационно-управленческой деятельности руководителя. Исходя из проведенного анализа научно-теоретической литературы, национального законодательства и правоприменительной практики определены цель и задачи управленческого мониторинга, рассмотрены его отличительные особенности, на основании которых сформулировано определение понятия «мониторинг» как общей функции управления.*

Несмотря на то что мониторинг давно востребован и применяется в различных сферах государственного управления[1], а также менеджмента социальными организациями, единого подхода к этому понятию в науке управления до сих пор не выработано. Несмотря на развитость прикладного мониторинга, общетеоретические вопросы рассмотрения его как общей функции управления разработаны недостаточно; четко не определены его цели и задачи, место в управленческом процессе и среди других функций управления; не рассмотрены его характерные признаки; не имеется единого подхода к понятию указателей (критери-

[1] В законодательстве Республики Беларусь выделяют демографический, экологический, правовой мониторинг, мониторинг чрезвычайных ситуаций природного и техногенного характера, мониторинг общественной безопасности и др., обусловленные предметной сферой их применения.